# *§ 31–0. Каланіяльная экспансія еўрапейскіх дзяржаў

**Характар узаемадзеяння Еўропы і іншых цывілізацый свету пасля Вялікіх геаграфічных адкрыццяў.** Вялікія геаграфічныя адкрыцці былі пераломным момантам у сусветнай гісторыі. З аднаго боку, яны прывялі да выяўлення новых марскіх шляхоў, народаў і мацерыкоў, да пашырэння далягляду пазнання еўрапейцамі навакольнага свету. З другога боку, паклалі пачатак маштабнаму і сістэматычнаму падпарадкаванню, разбурэнню і эксплуатацыі нееўрапейскіх цывілізацый.

Падчас Вялікіх геаграфічных адкрыццяў еўрапейскія дзяржавы (Іспанія, Партугалія, Англія, Францыя і іншыя) пачалі праводзіць агрэсіўную каланіяльную палітыку: захоп тэрыторый, усталяванне сваёй улады, знішчэнне мясцовых дзяржаў і культур. У Амерыцы былі вынішчаны мільёны людзей. Еўрапейцы разбурылі дзяржавы ацтэкаў і інкаў, знішчылі храмы, перапісалі гісторыю і навязалі каталіцызм. Мясцовае насельніцтва масава гінула не толькі ў вайсковых сутыкненнях, але і ад прымусовай працы, хвароб і голаду.

У Індыі спачатку партугальцы, а пасля брытанцы захоплівалі парты, мяшаліся ў войны паміж княствамі, разбуралі мясцовую эканоміку. Еўрапейскія гандляры падарожнічалі з войскамі, якія яны наймалі для аховы сваіх тавараў. Гэтыя арміі рабіліся нават большымі за многія нацыянальныя арміі ў Еўропе. Гандляры таксама набіралі мясцовых салдат, якіх называлі сіпаямі. Па меры таго як усё больш еўрапейскіх войскаў размяшчалася ў партовых гарадах уздоўж узбярэжжа Індыі, рабілася відавочным, што іх ваенная моц можа ператварыцца ў камерцыйную перавагу. Еўрапейцы пачалі больш удзельнічаць у мясцовай палітыцы

Якім чынам існаванне мноства разрозненых дзяржаўных утварэнняў і народаў у Індыі, Амерыцы і Афрыцы паўплывала на досыць хуткае іх падпарадкаванне еўрапейскімі каланізатарамі?



*Вялікі Магол Шах Алам перадае права на збор падаткаў лорду Клайву. Мастак Б. Уэст. 1818 г.*

Як вы лічыце, у сувязі з чым адным з першых слоў, што прыйшлі ў англійскую мову з хіндзі, было слова «красці, рабаваць»?

і ў ваенных звадах, каб атрымоўваць шырэйшы доступ да тавараў і зямлі. Напачатку XVIII ст. англійская Ост-Індская кампанія фактычна кіравала значнаю часткай Індыі, абкладала насельніцтва падаткамі, выцягвала рэсурсы і падаўляла паўстанні.

У Афрыцы еўрапейцы стваралі прыбярэжныя ўмацаваныя пункты, гандлявалі не толькі таварамі, але і людзьмі. Адным з найбольш змрочных наступстваў іх «узаемадзеяння» з мясцовымі племяннымі правадырамі было развіццё трансатлантычнага гандлю рабамі. Мільёны афрыканцаў былі гвалтам перавезены еўрапейцамі ў Амерыку, дзе працавалі на плантацыях. Гэта прывяло да цяжкіх наступстваў для афрыканскіх грамадстваў: разбурэння абшчын, войнаў, вымірання цэлых народаў. Рабства ператварылася ў аснову эканомікі многіх амерыканскіх калоній, асабліва ў Карыбскім рэгіёне, Бразіліі і паўднёвых штатах будучых ЗША.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Рабства існавала ў Афрыцы і да прыбыцця еўрапейцаў. Аднак еўрапейская каланізацыя Амерыкі зрабіла попыт на рабскую працу настолькі велізарным, што гандляры і іх агенты шукалі сваіх ахвяр далёка ў глыбіні амерыканскага мацерыка, спустошваючы рэгіён. Магутныя афрыканскія правадыры падсілкоўвалі гэтую практыку, бо мянялі рабоў на такія тавары, як алкаголь, пацеркі і тканіны.

Паводле розных падлікаў, за час трансатлантычнага гандлю рабамі было заняволена ад 10 да 18 млн афрыканцаў. Транспарціроўка палонных уяўляла сабой пакутлівае марское падарожжа: мноства людзей душылася ў вельмі малых памяшканнях, мужчыны, жанчыны і дзеці былі разлучаны, а сем'і разарваны. Перанаселенасць, дрэннае харчаванне, абязводжванне і хваробы вялі да высокага ўзроўню смяротнасці (ад 15 да 20 %). Так, 450 тыс. з 3,4 млн афрыканцаў, якіх перавозілі на брытанскіх караблях, загінулі, перасякаючы Атлантыку. Тых, хто супраціўляўся, адмаўляўся ад ежы і вады, збівалі і гвалтам кармілі. Спробы больш арганізаванага паўстання афрыканцаў караліся яшчэ больш жорстка. Шматлікія смерці ў Афрыцы назіраліся яшчэ і ў перыяд паміж захопам у палон і пагрузкай на карабель, асабліва ў тых выпадках, калі палонным даводзілася пераадольваць сотні міль, каб дабрацца да ўзбярэжжа.

Страты афрыканскага насельніцтва былі катастрафічныя, бо ў першую чаргу вывозіліся здаровыя маладыя мужчыны і жанчыны. Рабаўладальнікі аддавалі перавагу ахвярам ва ўзросце 15–25 гадоў, а найлепей 20-гадовым. Еўрапейцы абарачалі ў рабства мужчын часцей, чым жанчын (прыкладныя суадносіны 2 да 1), часцяком забіралі зусім маленькіх дзетак і амаль ніколі — старых. Яны развозілі ў розныя краі самых здаровых, асабліва тых, хто перахварэў на чорную воспу і набыў імунітэт да адной з самых смяротных хвароб у свеце.

Апынуўшыся на зусім чужой для сябе зямлі ў рабскім стане, людзі ўсё адно змагаліся за захаванне сваіх сем'яў, звычаяў і чалавечага гонару. Супраціўленне набывала розныя формы: ад падтрымання сваёй культурнай ідэнтычнасці да ўцёкаў і арганізацыі паўстанняў. На плантацыях рабы ламалі інструменты, псавалі ўраджай і прыкідваліся параненымі або хворымі, каб разбурыць спадзяванні ўладальнікаў на вялікі прыбытак. У іншых выпадках яны рабілі стаўку на свабоду і збягалі. Часам уцекачы аб'ядноўваліся і стваралі групы супраціўлення.

1. *Растлумачце, чаму ў Новы час зрабілася магчымым вяртанне і даволі вялікае пашырэнне такой цяжкай з'явы, як гандаль рабамі.*
2. *Адкуль сучасныя гісторыкі могуць узяць звесткі пра колькасць афрыканцаў, захопленых еўрапейцамі ў палон? Чаму гэтыя лічбы заўсёды будуць даволі прыблізныя?*

*3. Чаму захаванне культурнай ідэнтычнасці захопленых у палон афрыканцаў, якія прымусова жылі і па-рабску працавалі ў Амерыцы, выступала як адна з формаў супраціўлення рабаўладальнікам?*

*4. Уносячы лепту ў захаванне памяці пра ахвяр каланіяльнага рабаўладальніцтва, ААН афіцыйна заснавала Міжнародны дзень памяці ахвяр рабства і трансатлантычнага гандлю рабамі. Даведайцеся, у сувязі з якой гістарычнай падзеяй была абрана канкрэтная дата і чаму менавіта яна з'яўляецца знамянальнай сярод іншых цяжкіх старонак у гісторыі каланіялізму.*

*5. Апішыце, што вы бачыце на фотаздымку. Выкажыце здагадку, зыходзячы з тэксту рубрыкі, што сімвалізуюць вобраз і назва мемарыяла.*



*Мемарыял «Каўчэг вяртання»*

*6. Помнік з'яўляецца трохчасткавым: карта трохвугольнай формы, ляжачая чалавечая постаць, трохвугольны басейн. Паразважайце пра магчымы сэнс кожнага элемента, абапіраючыся на ўласнае веданне гістарычных падзей. Знайдзіце падрабязнае апісанне мемарыяла на афіцыйным сайце ААН і звер-це яго са сваімі здагадкамі.*

Стварэнне калоній мела адну асноўную мэту: захоп рэсурсаў і рынкаў збыту. Калоніі былі цалкам падпарадкаваныя эканамічным інтарэсам еўрапейскіх дзяржаў. У Амерыцы ствараліся плантацыі, дзе працавалі заняволеныя індзейцы і афрыканцы, а ўсе даходы ішлі ў Іспанію і Партугалію. У Індыі знішчаліся традыцыйныя рамёствы і гандаль, у выніку чаго насельніцтва было вымушана купляць англійскія тавары. Рэсурсы (чай, бавоўна, спецыі) вывозіліся ў Еўропу, у той час як мясцовыя сяляне пакутавалі пад гнётам падаткаў і галадалі. На

Афрыканскім кантыненце была разбураная традыцыйная сацыяльная структура, увесь час вяліся войны дзеля захопу рабоў.

Не варта забывацца, што каланізацыя суправаджалася не толькі ваеннай і эканамічнай экспансіяй, але і культурным пранікненнем. Хрысціянства часцяком насаджалася гвалтоўна, місіянеры фактычна дзейнічалі як праваднікі каланізацыі. У Амерыцы з іх удзелам знішчаліся мясцовыя вераванні, разбураліся храмы, паліліся старажытныя рукапісы. Народы Азіі і Афрыкі разглядаліся еўрапейцамі як «адсталыя» і «недаразвітыя».

Пасля Вялікіх геаграфічных адкрыццяў Еўропа ўсталявала панаванне над іншымі цывілізацыямі свету, якое грунтавалася на ваеннай моцы, выцягванні рэсурсаў, культурным ціску і заняволенні народаў. Каланіяльная сістэма ператварылася ў сімвал эксплуатацыі і пакінула цяжкую спадчыну, наступствы якой адчуваюцца дагэтуль. Еўрапейскія дзяржавы і гандлёвыя кампаніі «зарабілі» велізарныя капіталы, якія ляглі ў аснову будучай прамысловай рэвалюцыі.

Чаму слова «зарабілі» ў дадзеным кантэксце ўзята ў двукоссі?

Характар узаемадзеяння Еўропы з іншымі цывілізацыямі ў асноўным быў аднабаковы. Еўропа навязвала свае ўмовы, падпарадкоўвала эканомікі, разбурала традыцыйныя парадкі. З другога боку, не варта забывацца, што аб'ектыўна паміж цывілізацыямі пачаўся актыўны абмен таварамі, тэхналогіямі і культурамі. Еўропа шмат запазычыла з іншых культур: не толькі ўсходнюю прадукцыю і тэхналогіі, але і філасофскія і навуковыя ідэі, асабліва ў эпоху Асветніцтва.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Паўхатан, Пакахонтас, Джон Сміт, Джон Рольф.

*1. Даведайцеся, як звязаныя імёны чатырох пералічаных гістарычных дзеячаў.*

2. *Складзіце паведамленне пра ўзаемаадносіны еўрапейцаў і карэнных народаў Амерыкі на прыкладзе гісторыі паўхатанаў і англічан (з выкарыстаннем карты, дат, імён гістарычных асоб, прадстаўленых выяў, значных прыкладаў і інш.).*



*Англійскія перасяленцы гандлююць з індзейцамі ў форце Джэймстаўн*



*Бюст Паўхатана ў індзейскай рэзервацыі Вірджынія*




*Адзіная выява Пакахонтас, зробленая з натуры*

3. *Чым адрозніваюцца рэальная і мультыплікацыйная гісторыі Пакахонтас? Чаму ёсць гэтыя адрозненні?*
4. *Якія пазітыўныя і негатыўныя факты з каланіяльнай мінуўшчыны Амерыкі выяўляе асабістая гісторыя Пакахонтас?*